# КАБ НА МАГІЛЁЎШЧЫНЕ БЫЎ ЖАЛЕЗНЫ ПАРАДАК

**Леанід Заяц, які нядаўна быў вызвалены з пасады міністра сельскай гаспадаркі і харчавання, зойме пасаду старшыні Магілёўскага абласнога выканаўчага камітэта, а Міхаіл Русы, да нядаўняга часу — віцэ-прэм'ер, — пасаду памочніка Прэзідэнта — інспектара па Магілёўскай вобласці. Учора Прэзідэнт падпісаў адпаведныя ўказы.**

Па словах кіраўніка дзяржавы, за ўсё, што адбывалася ў краіне ў сферы сельскай гаспадаркі, названыя чыноўнікі неслі персанальную адказнасць — таму нядаўна яны і былі вызваленыя са сваіх пасад.

«Пачынаючы ад маіх канкрэтных даручэнняў па пэўных культурах — лёне, рапсе і іншых — і да тэхналогій у сельскай гаспадарцы і экспарце прадукцыі на іншыя рынкі, — сказаў Прэзідэнт. — І я папрасіў бы вас яшчэ раз, каб вы не думалі, што гэта нейкі экспромт з-за нейкай фермы ў Сліжах. Слухайце, там ёсць каму займацца фермамі, і яны павінны былі гэтым займацца. Яны цяпер і займаюцца. Гэта справа перш за ўсё кіраўніка гаспадаркі і старшыні райвыканкама».

Таму, дадаў Прэзідэнт, не трэба думаць пра тое, што беспарадак на фермах і машынных дварах у аграхолдынгу «Купалаўскае» ў Шклоўскім раёне прывёў да адстаўкі аднаго і другога.

Аляксандр Лукашэнка заявіў, што запрасіў Міхаіла Русага і Леаніда Зайца, каб агучыць прынятае ім рашэнне: «Гэта загад: вы ўдваіх едзеце ў Магілёўскую вобласць, наведзяце там жалезны парадак і далажыце мне. Я буду ў вас кожны месяц у Магілёўскай вобласці. Чым змагу, тым дапамагу. Але перш за ўсё вы там пасееце як трэба, па тэхналогіі. І на працягу месяца, калі вам трэба перавесці Магілёўшчыну на ваеннае становішча, як цяпер у «Купалаўскім», пераводзьце».

Кіраўнік дзяржавы падкрэсліў, што неабходна жалезная дысцыпліна, а таксама — што галоўнае — арганізаваць работу ў сельскай гаспадарцы па тэхналогіі:

«Прымусьце, навучыце іх дзейнічаць па тэхналогіі. Не можа Магілёўская вобласць плесціся ў хвасце з такімі глебамі, якімі яна валодае. Гэта выдатныя землі».

**Паводле БелТА.**

# НАШЫ ЛЁСЫ ПЕРАПЛЕЦЕНЫ

**Калі Беларусь можа зрабіць нешта большае для міру ва Украіне — мы гатовы гэта зрабіць**

**Такое меркаванне выказаў Прэзідэнт Беларусі падчас сустрэчы з спецпрадстаўніком дзеючага старшыні АБСЕ ва Украіне і Трохбаковай кантактнай групе Марцінам Сайдзікам.**

«Прыемна з вамі сёння сустрэцца. Бачу вас як байца пастаянна — на працягу пяці гадоў — на ўкраінскім фронце, але на тэрыторыі Беларусі, гэта сімвалічна, — адзначыў беларускі лідар. — Вы ведаеце маё стаўленне, беларусаў стаўленне да гэтага канфлікту, ва Украіне. Усё, што вы кажаце, усе вашы заявы — а я іх усе чую — мы аналізуем іх. Разыходжанняў у нас практычна няма».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што не толькі ён асабіста, але і беларусы адданыя міру на Украіне. «Чаму — вы таксама ведаеце, гэта непасрэдна наша рэспубліка, з якой мы жылі доўгі час у адным доме. Вельмі пераплецены лёсы многіх сем'яў і многіх людзей, беларусаў і украінцаў. Гэта не чужая нам краіна. Таму натуральнае і наша стаўленне да гэтага канфлікту. І ў сувязі з гэтым я хачу вас запэўніць, што Беларусь заўсёды будзе прыкладаць максімум намаганняў для таго, каб падтрымаць дзейнасць вашай групы — групы, якой вы кіруеце, — і вас, як спецпрадстаўніка Арганізацыі па бяспецы і супрацоўніцтве ва Украіне», — сказаў Прэзідэнт.

Аляксандр Лукашэнка таксама звярнуў увагу, што Беларусь са свайго боку робіць усё магчымае ў гэтым кірунку. «І я ведаю ваша меркаванне, што, увогуле, прэтэнзій да нас з боку АБСЕ ў гэтым кірунку няма», — дадаў ён.

«Не толькі няма — мы толькі ўдзячныя», — у адказ заявіў Марцін Сайдзік.

Кіраўнік дзяржавы падзякаваў яму за гэта і падкрэсліў, што «калі мы можам зрабіць нешта большае для міру ва Украіне, мы гатовыя гэта зрабіць».

«Вялікі вам дзякуй за тое, што вы мяне прымаеце. Не толькі за гэта, але і сапраўды за ўжо шматгадовую — на жаль, трэба сказаць — падтрымку, таму што можна было б вырашыць гэты канфлікт даўным-даўно», — падкрэсліў спецпрадстаўнік.

Паводле яго слоў, Мінск як месца перагавораў — гэта менавіта тое, што цяпер трэба. «Так, гэты канфлікт цягнецца ўжо занадта доўга. Занадта доўга не толькі для народа, для людзей, якія пакутуюць ад гэтага. Занадта доўга, я думаю, што і для нас з вамі», — сказаў Марцін Сайдзік.

Па выніках сустрэчы з Прэзідэнтам Марцін Сайдзік пагутарыў з журналістамі.

Ён адзначыў, што асноўнай тэмай гутаркі з кіраўніком дзяржавы стаў канфлікт на ўсходзе Украіны. Сітуацыя абмяркоўвалася ў тым ліку ў сувязі з выбарамі Прэзідэнта ва Украіне.

Што датычыцца ўрэгулявання канфлікту, то ён і кіраўнік беларускай дзяржавы прытрымліваюцца аднаго меркавання: трэба спыніць пакуты грамадзянскага насельніцтва. «Занадта шмат людзей загінула ў гэтым канфлікце», — сказаў Марцін Сайдзік.

Ці ішла на сустрэчы гаворка пра нейкія новыя падыходы па вырашэнні сітуацыі? «Мы абмяркоўвалі гэта, я меў магчымасць казаць пра ідэі, якія мы вылучылі яшчэ ў снежні мінулага года ў Мілане, з нагоды сумеснай місіі ААН і АБСЕ», — дадаў Марцін Сайдзік.

**Уладзіслаў ЛУКАШЭВІЧ.**

### У тэму

Коратка нагадаем гісторыю ўдзелу АБСЕ ва ўрэгуляванні крызісу ва Украіне:

Сакавік 2014 года — прынята рашэнне аб разгортванні Спецыяльнай маніторынгавай камісіі АБСЕ ва Украіне. Гэта няўзброеная грамадзянская місія, якая кругласутачна адсочвае сітуацыю і садзейнічае дыялогу паміж бакамі канфлікту.

8 чэрвеня 2014 года — створана Трохбаковая кантактная група (ТКГ) па Украіне, а пазней — яе чатыры рабочыя падгрупы: па бяспецы, па палітычных, эканамічных і гуманітарных пытаннях.

Пры непасрэдным удзеле членаў ТКГ былі дасягнуты Мінскія дамоўленасці 5 і 19 верасня 2014 года («Мінск-1»), аднак неўзабаве бакі канфлікту фактычна перасталі іх выконваць.

У ходзе саміту 12 лютага 2015 года ў Мінску быў узгоднены дакумент, які атрымаў назву «Комплекс мер па выкананні Мінскіх пагадненняў» («Мінск-2»).

Пасля «Вялікай размовы»

# У якім напрамку пашырацца гораду?

**«У Гродне будуюць новы мікрараён Грандзічы-2. Гэта на ўскрайку горада, побач з камбінатам будаўнічых матэрыялаў. Летам там часцяком бываюць шызымі дрэвы ад выкідаў камбіната, — расказвае ў сваім звароце да Прэзідэнта гродзенец Юрый Куляшоў і пытае. — Чаму будуюць так далёка, калі ў Гродне ёсць шмат месцаў са старой, вельмі старой прыватнай забудовай. Нават без вырад. Можна ж у горадзе будавацца, а прыватныя хаты — на ўскрайку».**

Мы вырашылі распытаць гарадскія ўлады, ці мае рацыю гродзенец адносна шкоднасці ўздзеяння выкідаў і магчымасцях будаваць жыллё ў іншых — бліжэйшых да цэнтра — месцах.

Як паведамілі ў гарвыканкаме, будаўніцтва мікрараёна Грандзічы-2 прадугледжана генпланам Гродна. Ён месціцца на поўнач ад мікрараёнаў Дзевятоўка-6, 7 на адлегласці прыкладна трох кіламетраў ад прадпрыемства філіял № 5 «Гродзенскі камбінат будаўнічых матэрыялаў» ААТ «Красносельскбудматэрыялы». Базавая санітарна-ахоўная зона для гэтага прадпрыемства складае 500 метраў.

— Яшчэ ў 2015 годзе згодна з патрабаваннямі заканадаўства ў галіне забеспячэння санітарна-эпідэміялагічнага дабрабыту насельніцтва для прадпрыемства быў распрацаваны праект санітарна-ахоўнай зоны з разлікамі рассейвання выкідаў забруджвальных рэчываў у атмасферным паветры, узроўняў фізічнага ўздзеяння і ацэнкі рызыкі для жыцця і здароўя людзей. Праводзіцца аналітычны (лабараторны) кантроль для пацвярджэння разліковых памераў санітарна-ахоўнай зоны. Жылая забудова ў межах разліковай санітарна-ахоўнай зоны прадпрыемства адсутнічае і не плануецца да будаўніцтва, — паведаміў **першы намеснік старшыні гарвыканкама Андрэй ЖУК.**

Што датычыцца магчымасцяў будаўніцтва жылля бліжэй да цэнтра, ён нагадаў, што гарвыканкам імкнецца рацыянальна выкарыстоўваць гарадскія тэрыторыі дзеля гэтых мэт, дзякуючы ушчыльненню існуючай жылой забудовы, выкарыстанню тэрыторый вытворчых пляцовак і вайсковых часцей, якія падлягаюць вынасу за межы гарадскіх тэрыторый.

За кошт гэтага атрымліваецца знайсці прывабныя лапікі зямлі, на якіх будуюцца шматпавярхоўкі. Напрыклад, такая забудова (амаль 90 тысяч «квадратаў» жылля) з'явілася ў раёне вуліц Татарскай — Камбайнерскай на месцы ранейшай сядзібнай забудовы і былой вайсковай часці па вуліцах Пралетарскай — Шчорса, такі ж амаль па квадратах жылых комплекс Калбасіно вырас па вуліцы Суворава. Акрамя гэтага распрацаваны праект дэталёвага планавання мікрараёна шматпавярховікаў на тэрыторыі былога ваеннага гарадка па вуліцы Лідскай, разлічаны на 114 тысяч квадратных метраў жылля.

Але гэта далёка не ўсе планы гарадскіх улад адносна ўшчыльнення забудовы. Ужо завяршаецца распрацоўка праекта дэталёвага планавання мікрараёна ўздоўж падаўжэння вуліцы Астроўскага і ў раёне вуліц Церашковай — Каханоўскага. У перспектыве тут пабудуюць 85 тысяч жылых «квадратаў». Праект дэталёвага планавання мікрараёна Вясновы ў раёне вуліц Каліноўскага-Вясновай таксама прадугледжвае будаўніцтва жылых высотак на 100 тысяч квадратных метраў.

— Акрамя гэтага мы працуем па кропкавым ушчыльненні існуючай шматкватэрнай забудовы, у той час як асноўныя тэрыторыі пад перспектыўнае сядзібнае будаўніцтва знаходзяцца ў перыферыйнай зоне горада, — падкрэслілі ў гарвыканкаме.

**Вольга АНУФРЫЕВА.**

Суседзі

# Хто наступны слуга народа?

**У першым туры выбараў прэзідэнта Украіны перамогу атрымаў комік Уладзімір Зяленскі — і гэта не першакрасавіцкі жарт.**

Сюжэт папулярнага ўкраінскага камедыйнага серыяла «Слуга народа» на бягучых прэзідэнцкіх выбарах амаль увасабляецца ў жыццё. Прынамсі, у аднойчы да выканаўцы галоўнай ролі Уладзіміра Зяленскага. Калі яго герой стаў кіраўніком дзяржавы нечакана для самога сябе, то акцёр аб'явіў аб сваім рашэнні балатавацца на пост у навагоднюю ноч. За тры месяцы ён змог даказаць значнай часткі жыхароў Украіны, што ў кожным жарце толькі частка жарту.

Вылучыла на выбары Уладзіміра Зяленскага партыя «Слуга народа». Акрамя яго была кэвээншчыка ў бюлетэні для галасавання значыліся яшчэ 38 імёнаў. І гэта адна з цікавінак выбарчай кампаніі ва Украіне. Але рэальную канкурэнцыю Зяленскаму склалі толькі некалькі кандыдатаў — дзеючы прэзідэнт Пётр Парашэнка, лідар партыі «Бацькаўшчына» Юлія Цімашэнка.

Выказалі сваю грамадзянскую волю ў нядзелю амаль 64 % украінцаў, якія маюць права ўдзелу ў выбарах. Для безагаворачнай перамогі кандыдат павінен атрымаць 50 % плюс адзін голас выбаршчыкаў. У выпадку, калі ні адзін з удзельнікаў гонкі не набярэ такой колькасці галасоў, будзе прызначана паўторнае галасаванне. Пра тое, што без другога тура не абысціся, ужо афіцыйна заявіла старшыня ЦВК Украіны Таццяна Сліпачук.

«Я падкрэсліваю, што будзе другі тур. Перад ЦВК стаіць вельмі амбіцыйная наступная задача — часавы прамежак паміж канчатковым падвядзеннем вынікаў і прызначаным ужо на 21 красавіка другім турам вельмі і вельмі кароткі», — сказала Таццяна Сліпачук.

Пасля падліку 90 % пратаколаў у прадстаўніка партыі «Слуга народа» Уладзіміра Зяленскага — 30,26 % галасоў, прэзідэнта Пятра Парашэнкі — 15,98 %. На трэцім месцы Юлія Цімашэнка з 13,36 %. Таму па ўсёй верагоднасці за крэсла прэзідэнта ў другім туры будуць змагацца Уладзімір Зяленскі і Пётр Парашэнка. Большасць галасоў дзеючы кіраўнік дзяржавы атрымлівае ў заходніх абласцях Украіны, за Уладзімірам Зяленскім першынство ў сталіцы і 19 абласцях.

Па словах экспертаў, вынікі другога тура будуць залежаць ад кааліцый, якія сфарміруюць лідары выбараў. Асаблівы напал дадаюць і будучыя ў кастрычніку парламенцкія выбары ва Украіне. Многія ўдзельнікі гэтага працэсу будуць выказваць свае перавагі з аглядкай на будучае размеркаванне дэпутацкіх партфеляў.

**Марыя ДАДАЛКА.**

# ШТО Ў СВЕЦЕ РОБІЦЦА

## У Японіі абвясцілі назву эры праўлення новага імператара

Урад Японіі абвясціў назву эры, якая пачнецца 1 мая з уступленнем на трон новага імператара. Новая эра будзе называцца Рэйва, паведамляе японская тэлерадыёкампанія NHK.

Генеральны сакратар кабінета міністраў Ёсіхідэ Суга паведаміў учора прадстаўнікам СМІ назву эры і прадэманстраваў, якімі іерогліфамі яна запісваецца. Ён растлумачыў, што назва ўзята з найстарэйшай з існуючых анталогій японскай паэзіі «Ман'есю» (прыкладна VII—VIII стагоддзі). Слова «Рэйва» ўмоўна можна перакласці як «парадак і гармонія», піша ТАСС.

Цяперашні 85-гадовы імператар Японіі Акіхіта пакіне трон 30 красавіка па ўласнай просьбе ў сувязі са старэчым узростам. На наступны дзень, 1 мая, новым імператарам будзе абвешчаны яго старэйшы сын — наследны прынц Нарухіта. Гэта і будзе азначаць наступленне першага года эры Рэйва.

## СМІ паведамляюць аб знікненні самай дарагой у свеце карціны

У Луўры Абу-Дабі (філіял парыжскага Луўра) не ведаюць, дзе знаходзіцца палатно Леанарда да Вінчы «Збаўца свету». Гэтая карціна, прададзеная ў 2017 годзе на аўкцыёне за $450,3 млн, лічыцца самай дарагой у свеце. Пра гэта паведамляе газета The New York Times.



Супрацоўнікі Луўра ў Абу-Дабі на ўмовах прыватнасці прызнаюцца, што ім нічога невядома пра месцазнаходжанне палатна, піша выданне. Парыжскі Луўр таксама не валодае гэтай інфармацыяй.

The New York Times нагадвае, што ў верасні 2017 года павінна была адбыцца прэзентацыя карціны. Аднак яе адмянілі без тлумачэння прычын. У матэрыяле NYT адзначаецца, што адмена прэзентацыі стала прычынай таго, што некаторыя эксперты зноў пачалі выказваць сумненні ў сапраўднасці палатна. Між тым у Францыі разлічваюць, што карціна будзе знойдзена і ўвосень яе змогуць убачыць наведвальнікі выстаўкі, прымеркаванай да 500-годдзя з дня смерці Леанарда да Вінчы.